Источник: "Звязда" - 2013-05-29

Міжнародны дзень міратворцаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

1453 год — пасля трохдзённага штурму турэцкае войска султана Мехмеда II Заваёўніка захапіла сталіцу Візантыі Канстанцінопаль. Так быў пакладзены канец 1100-гадовай гісторыі хрысціянскай Візантыйскай імперыі. Яе апошні імператар Канстанцін XI Палеолаг (дзядзька Соф'і Палеолаг, бабкі Івана Грознага) загінуў, гераічна змагаючыся ў радах абаронцаў горада. Яго апазналі ў велізарнай гары загінулых па маленькіх залатых двухгаловых арлах на пурпуровых саф'янавых ботах. Султан загадаў пахаваць імператара з належнай пашанай. У захопленым Канстанцінопалі пачаліся рабаванні і забойствы; больш за 60 тысяч чалавек былі ўзяты ў палон. Апошнія рэшткі некалі вялікай імперыі — Марэя і Трапезунд — трапілі пад турэцкае валадарства ў 1460-м і 1461 гадах адпаведна. Асманская імперыя рушыла на Еўропу.



1585 год — адкрыўся Полацкі школьны тэатр. Існаваў ён пры полацкім езуіцкім калегіуме ажно да 1819 года. У рэпертуары тэатра пераважалі драмы на рэлігійныя, міфалагічныя і гістарычныя сюжэты. Яны ставіліся пераважна на лацінскай, зрэдку на польскай, часам на беларускай мовах. Паказы былі прымеркаваны да Масленіцы, іншых народных святаў, да летніх вакацый і да завяршэння навучальнага года. Аўтарамі пастановак былі выкладчыкі калегіума. Сярод спектакляў: «Вясёлае пасля хмар сонца», «Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба», «Крушэнне карабля на сушы» і іншыя.

1932 год — нарадзіўся Юрый Панцеляймонавіч Грыгор'еў, заслужаны архітэктар Беларусі (1976), заслужаны архітэктар Расіі (1993). У 1974-86 гадах — намеснік старшыні Дзяржбуда Беларусі, галоўны архітэктар Мінска. Асноўныя працы: генпланы многіх буйных прамысловых аб'ектаў у гарадах Беларусі, у Мінску — інстытуты тэхнічнай кібернетыкі і электронікі НАН Беларусі, крыты каток у парку імя М. Горкага, Дом літаратара і іншыя. У 1973-75 гадах быў старшынёй праўлення Саюза архітэктараў Беларусі.

Было сказана

Максім ЛУЖАНІН (1909-2001), паэт, празаік, кінадраматург, перакладчык:

«Суджана, стаўлена пад перакладзіны,
Сечана, палена, а не аддадзена,
Не парастрачана і не раскрадзена,
Рупна ў падмуркі на золку пакладзена
Роднае слова».